**Метадычныя рэкамендацыі па складанні і ацэньванні тэставых работ па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»**

У адпаведнасці з «Метадычнымі ўказаннямі па арганізацыі кантролю і ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па вучэбных прадметах пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, прымяненні норм ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па вучэбных прадметах» адной з формаў паўрочнага і тэматычнага кантролю з’яўляецца тэставая работа. Акрамя таго, тэставыя работы праводзяцца і як навучальныя.

У Дадатку 4 «Метадычных рэкамендацый па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі» (далей – дадатак 4), па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» прыводзяцца кантрольныя (для X–XI класаў) і навучальныя (для VIII–XI класаў) тэставыя работы, на напісанне якіх адводзіцца асобны ўрок. У змесце такіх тэставых работ прадугледжана заданне пятага ўзроўню вучэбнай дзейнасці з разгорнутым адказам (частка С).

З дапамогай тэставых работ з часткай С правяраюцца ступень засваення тэарэтычнага матэрыялу і ўзровень сфарміраванасці вучэбна-моўных і камунікатыўных уменняў і навыкаў вучняў.

Акрамя ўказаных у дадатку 4 навучальных тэставых работ (з часткай С), на напісанне якіх адводзіцца асобны ўрок, настаўнік у адпаведнасці з каляндарна-тэматычным планаваннем і матэрыялам вучэбнага дапаможніка ў V–XI класах можа праводзіць навучальныя тэставыя работы (без часткі С), на выкананне якіх адводзіцца частка ўрока.

**Этапы распрацоўкі тэставай работы**

У распрацоўцы тэставай работы можна выдзеліць наступныя этапы (малюнак 1): планаванне, складанне заданняў, складанне ключа.



Малюнак 1. – Этапы распрацоўкі тэставай работы

**Этап I. Планаванне**

**1.1. Вызначэнне мэты тэсціравання**

Тэставыя работы могуць выкарыстоўвацца на розных этапах навучання: перад вывучэннем тэмы, у час вывучэння тэмы, пасля вывучэння тэмы (тэм).

Тэставыя работы, якія выконваюцца перад вывучэннем тэмы, накіраваны на ацэнку ступені падрыхтаванасці вучняў да асваення вучэбнага зместу (у пэўным класе, на наступнай ступені адукацыі, новага раздзела). Зместам такой тэставай работы з'яўляецца вучэбны матэрыял папярэдняга этапу навучання. Такія тэставыя работы з'яўляюцца сродкам актуалізацыі ведаў і ўменняў вучняў, неабходных для наступнага асваення зместу вучэбнага прадмета. Таму такія тэставыя работы дарэчы выкарыстоўваць не толькі ў пачатку навучальнага года, але і ў пачатку вывучэння новага раздзела або пры авалоданні новым комплексам уменняў.

У час вывучэння пэўнай тэмы тэставыя работы мэтазгодна выкарыстоўваць для дыягнаставання навучальнага працэсу, ацэнкі засваення вучнямі вучэбнага матэрыялу адпаведнай тэмы. Названы тып тэставай работы мае характар стымулявання, карэкціроўкі і выхавання. У яе змест уключаюцца асобныя элементы ведаў, уменняў, асвоеныя навучэнцамі на працягу аднаго-трох урокаў (напрыклад, тэставыя работы па тэмах «Правапіс літар *о, э, а*», «Віды падпарадкавальнай сувязі слоў у словазлучэнні»).

Тэставыя работы, прызначаныя для праверкі засваення вучнямі найважнейшых элементаў зместу адукацыі пасля вывучэння вялікай тэмы (групы тэм), раздзела, граматычнай з'явы і г. д., выкарыстоўваюцца звычайна на ўроках падагульнення і сістэматызацыі (напрыклад, тэставыя работы па тэмах «Назоўнік», «Словазлучэнне» і інш.).

Прадугледжаныя дадаткам 4 тэставыя работы з часткай С, якія дазваляюць ацаніць якасць засваення зместу пэўнага раздзела, вучэбна-моўных і камунікатыўных уменняў і навыкаў, мэтазгодна праводзіць у канцы навучальнага перыяду: чвэрці, паўгоддзя, года. Змест такіх тэставых работ, як правіла, ахоплівае вялікі аб'ём матэрыялу, структураваны ў лагічнай сістэме, якая адпавядае структуры вучэбнай праграмы (напрыклад, «Арфаграфічныя нормы», «Сінтаксічныя і пунктуацыйныя нормы»).

**1.2. Распрацоўка плана тэставай работы**

Змест тэставай работы распрацоўваецца з улікам патрабаванняў вучэбнай праграмы па вучэбным прадмеце.

Распрацоўка плана тэставай работы дазволіць пазбегнуць незбалансаванасці і дыспрапорцыі ведаў і ўменняў, якія правяраюцца тэставай работай.

План тэставай работы можа ўключаць у сябе наступную інфармацыю:

1) від тэставай работы;

2) пералік элементаў зместу тэм, раздзелаў, якія правяраюцца (у адпаведнасці з вучэбнай праграмай па вучэбным прадмеце);

3) агульная колькасць заданняў тэставай работы; тыпы, віды тэставых заданняў; колькасць балаў за кожнае заданне.

План тэставай работы можа быць пададзены ў форме табліцы:

| Нумар задання | Элементы зместу вучэбнай праграмы, якія правяраюцца | Тып і від тэставага задання | Правільныя адказы | Колькасць балаў за заданне |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| | | | | |

**Этап II. Складанне тэставых заданняў**

**2.1. Выбар тыпу тэставага задання**

У тэставай рабоце па беларускай мове рэкамендуецца выкарыстоўваць заданні розных тыпаў:

- заданні закрытага тыпу (з выбарам аднаго або некалькіх варыянтаў адказу) – частка А;

- заданні адкрытага тыпу (дапаўненне, пошук пэўнага аб’екта, заданні на ўстанаўленне адпаведнасці або правільнай паслядоўнасці) – частка В; заданні з разгорнутым адказам – частка С.

**Заданне закрытага тыпу** (частка А) падразумявае выбар адказу з прапанаваных варыянтаў.

Прыклады заданняў закрытага тыпу:

1) заданне «Так/Не» мае выгляд сцвярджэння, з якім вучань павінен пагадзіцца або не.

Прыклад 1. *Лексічнае значэнне слова раскрываецца ў арфаграфічным слоўніку.*

1. Так.
2. Не.

2) Заданне з выбарам аднаго або некалькіх правільных адказаў з прапанаваных.

Прыклад 2. *Літара А пішацца на месцы ўсіх пропускаў у радах:*

1) поч..рк, характ..р, ац..ніць;
2) ш..лясцець, ж..мчужына, с..рдэчны;
3) ш..снаццаць, пр..стыж, ч..мадан;
4) ч..рніцы, хр..стаматыя, ж..леза;
5) р..дыска, ц..гляны, майст..р.

Для заданняў з выбарам правільнага адказу (адказаў) рэкамендуецца прапаноўваць 4-5 элементаў для аналізу.

**Заданне адкрытага тыпу** падразумявае адсутнасць гатовых варыянтаў адказу, вучань павінен запісаць адказ самастойна. Заданні адкрытага тыпу могуць быць з кароткім адказам (частка В) і з разгорнутым адказам (частка С). У інструкцыі да такіх заданняў неабходна ўказаць форму адказу.

Прыклады заданняў адкрытага тыпу (частка В):

Прыклад 3. *Від падпарадкавальнай сувязі слоў у словазлучэнні, пры якім галоўнае і залежнае слова звязаны толькі па сэнсе, называецца ... . Адказ запішыце адным словам у назоўным склоне.*

Прыклад 4. *У сказах 7–11 знайдзіце словазлучэнне з падпарадкавальным відам сувязі кіраванне і выпішыце з яго залежнае слова ў той форме, у якой яно ўжыта ў тэксце.*

Прыклад 5. *Вызначце стыль тэксту. Адказ запішыце адным словам у назоўным склоне.*

Адным з відаў заданняў адкрытага тыпу з'яўляецца заданне на ўстанаўленне адпаведнасці. Яно ўяўляе сабой набор элементаў у двух слупках. Вучню патрэбна ўстанавіць адпаведнасць паміж элементамі левага і правага слупкоў. Наяўнасць загалоўкаў дазваляе вучню не траціць час на абагульненне элементаў у слупках і адразу перайсці да выканання задання, таму дастаткова фармулёўкі «Устанавіце адпаведнасць паміж элементамі слупкоў».

| Фразеалагізм | Значэнне фразеалагізма |
|---|---|
| А. Літара ў літару.<br>Б. Ад а да я (ад альфы да амегі).<br>В. Ставіць кропкі над «і».<br>Г. Прапісаць іжыцу | 1. Канчаткова высвятляць усё, не пакідаючы нічога недагаворанага, даводзячы ўсё да лагічнага канца.<br>2. Правучыць, пакараць каго-небудзь.<br>3. Ад пачатку да канца; цалкам.<br>4. Абсалютна дакладна, без адхіленняў (пісаць, паўтараць, выконваць і пад.).<br>5. Нікольki, зусім (не саступаць, не пераацэньваць і пад.) |

Пры адсутнасці загалоўкаў у слупках неабходна пісаць поўную інструкцыю.

Прыклад 6. *Вызначце, якімі часцінамі мовы з'яўляюцца выдзеленыя ў сказах словы і ўстанавіце адпаведнасць паміж элементамі слупкоў:*

| | |
|---|---|
| А. **Два** жоўтыя лісточкі трапяталі на дрэве.<br>Б. «Зноў **двойка**», – падумаў Вася.<br>В. Антосю **двойчы** давялося перарабляць работу.<br>Г. Дамоў вярнулася толькі **двое** аднакласнікаў | 1. Парадкавы лічэбнік.<br>2. Колькасны лічэбнік.<br>3. Зборны лічэбнік.<br>4. Назоўнік.<br>5. Прыслоўе |

Рэкамендуецца прыводзіць неаднолькавую колькасць элементаў левага і правага слупкоў, каб апошні элемент не выбіраўся метадам выключэння.

У інструкцыі да заданняў такога віду трэба прывесці ўзор запісу адказаў.

Прыклад 7. *Адказ запішыце ў выглядзе літарна-лічбавага выразу (улічыце, што трэба захоўваць літарную паслядоўнасць, лічбы могуць паўтарацца ці не сустракацца зусім). Напрыклад, А1Б1В5Г2.*

Заданне на ўстанаўленне правільнай паслядоўнасці – гэта таксама разнавіднасць заданняў адкрытага тыпу.

Прыклад 8. *Аднавіце парадак сказаў у тэксце. Адказ запішыце ў выглядзе паслядоўнасці лічбаў без прабелаў ці іншых раздзяляльных знакаў. Напрыклад, 54132.*

**Заданне з разгорнутым адказам (частка С)** накіравана на праверку камунікатыўных уменняў і навыкаў навучэнцаў і прадугледжвае стварэнне самастойнага аргументаванага выказвання (разгорнуты адказ) з апорай на прапанаваны тэкст.

У інструкцыі да задання трэба вызначыць аб'ём адказу, напрыклад:

прывядзіце не менш за тры аргументы ў пацвярджэнне свайго меркавання;

запішыце свае меркаванні (5-7 сказаў).

З дапамогай задання з разгорнутым адказам правяраецца маўленчае развіццё навучэнца: яго здольнасць самастойна вызначаць тэму і асноўную думку тэксту і падпарадкоўваць ёй выказванне, выбіраць адпаведны стыль і тып маўлення, ствараць тэкст у адпаведнасці з кампазіцыйнай будовай пэўнага тыпу, адбіраць моўныя сродкі, якія забяспечваюць дакладнасць і выразнасць маўлення, захоўваць нормы літаратурнай мовы.

Акрамя таго, самастойна складзенае вучнем выказванне дае магчымасць меркаваць пра яго агульную і маўленчую культуру, уменне выказаць уласныя меркаванні і абгрунтоўваць іх, карэктна ўступаючы ў дыялог з аўтарам тэксту, асабліва калі іх пазіцыі не супадаюць.

Прыклады заданняў часткі С з апорай на тэкст:

1. Сфармулюйце і абгрунтуйце ўласнае меркаванне (уласную пазіцыю) наконт праблемы (сітуацыі), якая абмяркоўваецца ў тэксце.

2. Вызначце пазіцыю аўтара тэксту па заяўленай праблеме, выкажыце і аргументуйце ўласнае меркаванне.

3. Абапіраючыся на інфармацыю тэксту, ацаніце і абгрунтуйце справядлівасць сцвярджэння: …

4. Абапіраючыся на інфармацыю тэксту, дайце разгорнуты аргументаваны адказ на пытанне: …

5. Спрагназуйце і абгрунтуйце далейшыя магчымыя падзеі на аснове тэкставай інфармацыі і г.д.

У залежнасці ад мэты праверкі і з улікам рэальных магчымасцей адукацыйнага працэсу ў тэставую работу з часткай С, на напісанне якой адводзіцца асобны ўрок, рэкамендуецца ўключаць 15 заданняў.

### 2.2. Фармуляванне пытання (інструкцыі)

1. Змест тэставага задання павінен адпавядаць патрабаванням вучэбнай праграмы; правяраць можна толькі тое, што вывучалі вучні.

2. Колькасць заданняў у тэставай рабоце не абавязкова павінна адпавядаць колькасці элементаў зместу вучэбнага прадмета, які неабходна праверыць. Не патрабуецца абавязковага ўключэння ў тэставую работу ўсіх элементаў зместу, бо многія з іх звязаны паміж сабой і могуць быць правераны адным тэставым заданнем.

3. Тэставая работа павінна ўключаць па магчымасці заданні розных тыпаў.

4. Форма тэставага задання павінна быць вядомай і не патрабаваць дадатковых інструкцый. Неабходна захоўваць адзіны стыль афармлення заданняў, якія ўваходзяць у адну тэставую работу.

5. Тэставае заданне павінна быць сфармулявана яснай, дакладнай мовай і выключаць неадназначны адказ. Фармулёўка задання павінна быць выкладзена кароткай, простай сінтаксічнай канструкцыяй, без паўтораў і двайных адмаўленняў, уводных і збыткоўных фраз. Пры складанні пытанняў варта асабліва ўважліва выкарыстоўваць словы «часам», «часта», «заўсёды», «усе», «ніколі», «які-небудзь», «можа быць», «або», «магчыма» і г. д.

6. Недапушчальныя заданні-пасткі, правакацыйныя або двухсэнсоўныя пытанні.

**2.3. Распрацоўка варыянтаў адказу**

1. Правільныя і няправільныя адказы, якія прапаноўваюцца ў заданнях закрытага тыпу, павінны быць адназначнымі па змесце, аднастайнымі па структуры і прыкладна аднолькавымі па колькасці слоў.

2. Усе варыянты адказаў павінны быць граматычна звязаны з асноўнай часткай задання.

3. Адказ на пастаўленае пытанне не павінен залежаць ад папярэдніх адказаў.

4. Неабходна прапаноўваць праўдападобныя памылковыя варыянты адказаў, узятыя з вопыту.

5. Указанне на адзін або некалькі правільных адказаў павінна прыводзіцца ў форме ліку асноўнага дзеяслова (калі адзін правільны адказ, то дзеяслоў ужываецца ў адзіночным ліку, калі некалькі правільных адказаў, то дзеяслоў ужываецца ў множным ліку).

6. Недапушчальна выкарыстоўваць варыянты адказаў «ні адзін з пералічаных», «няма правільных адказаў» або «ўсе пералічаныя», «усе адказы правільныя».

7. Пры чаргаванні правільных адказаў у пытаннях не павінна быць відавочнай сістэмы (напрыклад, заўсёды толькі першыя варыянты правільныя, ці правільнымі варыянтамі з'яўляюцца паслядоўна першы, другі, трэці варыянт і пад.).

Пры складанні тэставых заданняў рэкамендуецца выкарыстоўваць адкрыты банк тэставых матэрыялаў па вучэбных прадметах (Беларуская мова Республиканский Институт Контроля Знаний (rikc.by)), а таксама вучэбныя выданні, прыведзеныя ў спісе рэкамендаванай літаратуры да гэтых рэкамендацый.

**Этап III. Складанне ключа**

**3.1. Налічэнне балаў за кожнае заданне**

Тэставая работа (з часткай С) па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» (кантрольная, навучальная) складаецца з 15 заданняў, выкананне якіх у суме складае 33 балы. У табліцы прыведзены рэкамендацыі для вызначэння колькасці балаў за кожнае тэставае заданне.

| Від тэставага задання | Колькасць балаў |
|---|---|
| Заданне закрытага тыпу з выбарам аднаго адказу з мноства прыведзеных | Правільна выканана – 2 балы<br>Няправільна выканана – 0 балаў |
| Заданне адкрытага тыпу з запісам адназначнага адказу | Правільна выканана – 2 балы<br>Няправільна выканана – 0 балаў |
| Заданне закрытага тыпу з множным выбарам адказу | Правільна выканана – 2 балы<br>Часткова правільна выканана* – 1 бал<br>Няправільна выканана** – 0 балаў |
| Адкрытае заданне на ўстанаўленне адпаведнасці або правільнай паслядоўнасці | Правільна выканана – 2 балы<br>Часткова правільна выканана* – 1 бал<br>Няправільна выканана** – 0 балаў |
| Адкрытае заданне з разгорнутым адказам (частка С) | Максімальная колькасць – 5 балаў (3 балы за змест і маўленчае афармленне + 2 балы за пісьменнасць)*** |

**Заўвагі.**

*Часткова правільным лічыцца заданне, у якім дапушчана не больш за адну памылку пры выбары некалькіх адказаў з прапанаваных варыянтаў:

• адзначаны ўсе правільныя варыянты адказу і выбраны адзін лішні *(напрыклад, правільны адказ 13, а вучань указаў 123, або 134, або 135)*;

• не хапае аднаго дакладнага варыянта, прычым няправільных варыянтаў не адзначана *(напрыклад, правільны адказ 13, а вучань указаў толькі 1, або толькі 3; або правільны адказ 234, а вучань указаў 23, або 24, або 34)*.

У заданні на ўстанаўленне адпаведнасці часткова правільным лічыцца адказ, у якім памылкова адзначана адна лічба. Напрыклад, пры правільным адказе А1Б1В3Г2 прыведзены адказ А1Б2В3Г2.

**Адказ на заданне лічыцца няправільным і ацэньваецца 0 балаў, калі:

- адказ адсутнічае;

- указаны ўсе прапанаваныя варыянты (4 з 4, 5 з 5);

- у адказе дапушчана 2 (і больш) памылкі. Напрыклад, правільны адказ 24, а вучань указаў 23, г. зн. адзначыў лішні варыянт 3 і не ўказаў варыянт 4 (дапусціў 2 памылкі); ці дакладны адказ А5Б3В1Г2, а вучань указаў А3Б5В1Г2, г. зн. дапусціў 2 памылкі – у падборы адказаў да пунктаў А і Б.

Аналагічна ацэньваюцца заданні на ўстанаўленне правільнай паслядоўнасці.

***Пры ацэньванні заданняў адкрытага тыпу з разгорнутым адказам улічваюцца наступныя складнікі:

1. Змест (сэнсавае напаўненне) і маўленчае афармленне:

- разуменне асноўнай думкі зыходнага тэксту (вызначэнне аўтарскай пазіцыі, выяўленне праблемы);

- выказванне ўласнага меркавання (уласнай пазіцыі) і яго (яе) аргументаванасць;

- маўленчае афармленне (разнастайнасць слоўнікавага запасу і граматычнага ладу маўлення вучняў; стылявое адзінства і выразнасць маўлення, наяўнасць / адсутнасць маўленчых недахопаў).

2. Пісьменнасць:
- наяўнасць / адсутнасць арфаграфічных памылак;
- наяўнасць / адсутнасць пунктуацыйных памылак;
- наяўнасць / адсутнасць граматычных памылак.

**Рэкамендацыі па ацэньванні заданняў адкрытага тыпу з разгорнутым адказам (частка С)**

***Змест і маўленчае афармленне***

**3 балы** – тэма зыходнага тэксту і пазіцыя аўтара зразуметы дакладна, уласнае меркаванне выкладзена дакладна і выразна; для пацвярджэння свайго меркавання прыведзена не менш за тры аргументы (у адпаведнасці з інструкцыяй да задання), сярод якіх ёсць уласныя, заснаваныя на жыццёвым вопыце. Аргументы, заснаваныя на змесце тэксту, павінны быць у аўтарскай інтэрпрэтацыі, г.зн. яны не павінны цалкам супадаць з прыведзенымі ў тэксце. Аднатыпныя аргументы залічваюцца як адзін.

Выказванне характарызуецца багаццем слоўніка і разнастайнасцю выкарыстаных моўных сродкаў, лагічнасцю, дакладнасцю словаўжывання, выразнасцю; маўленчыя недахопы адсутнічаюць.

**2 балы** – пазіцыя аўтара вызначана правільна, выказана ўласнае меркаванне і даецца яго абгрунтаванне з прывядзеннем не менш як двух аргументаў, заснаваных на змесце тэксту, але ў аўтарскай інтэрпрэтацыі, або ўласных аргументаў, заснаваных на асабістым жыццёвым вопыце.

Выказванне ў цэлым характарызуецца багаццем слоўніка і разнастайнасцю выкарыстаных моўных сродкаў, лагічнасцю, дакладнасцю словаўжывання, выразнасцю; дапушчана не больш за тры маўленчыя недахопы.

**1 бал** – пазіцыя аўтара вызначана, выказана ўласнае меркаванне і даецца яго абгрунтаванне з прывядзеннем 1 аргумента, заснаванага на змесце тэкстаў, але ў аўтарскай інтэрпрэтацыі, ці ўласнага аргумента, заснаванага на асабістым жыццёвым вопыце, або ў якасці аргументацыі прыведзены прамыя цытаты з тэксту.

Выказванне характарызуецца беднасцю слоўніка і аднатыпнасцю сінтаксічных канструкцый, сэнсавая сувязь сказаў і паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі парушаюцца; дапушчана больш за тры маўленчыя недахопы.

**0 балаў** – пазіцыя аўтара вызначана няправільна, або ўласнае меркаванне не выказана, або прыводзяцца невыразныя, недарэчныя ці бессэнсоўныя прыклады, або адказ адсутнічае.

Выклад думак непаслядоўны, хаатычны, выказванне характарызуецца беднасцю слоўніка і граматычнага ладу маўлення; шматлікія маўленчыя недахопы.

***Пісьменнасць*** (наяўнасць/адсутнасць арфаграфічных, пунктуацыйных, граматычных памылак):

**2 балы** – 0 або 1 памылка (арфаграфічная, пунктуацыйная або граматычная);

1 бал – 2-3 памылкі;

0 балаў – 4 і больш памылкі.

Выстаўленне агульнага бала за разгорнуты адказ прадугледжвае падсумаванне балаў за змест і маўленчае афармленне, пісьменнасць.

**3.2. Перавод налічаных балаў у адзнаку**

Выстаўленне адзнакі за тэставую работу прадугледжвае:

1) падсумаванне ўсіх балаў, атрыманых за тэставую работу;

2) разлік аб'ёму выканання заданняў тэставай работы па формуле: набраную за тэставую работу колькасць балаў падзяліць на максімальна магчымую колькасць балаў і памножыць на 100.

| Аб'ём выканання задання, у % | Адзнака |
|---|---|
| 1–10 | 1 |
| 11–21 | 2 |
| 22–31 | 3 |
| 32–43 | 4 |
| 44–54 | 5 |
| 55–66 | 6 |
| 67–80 | 7 |
| 81–88 | 8 |
| 89–95 | 9 |
| 96–100 | 10 |

Напрыклад, у тэставай рабоце (з часткай С) з 15 заданняў, вучань набраў з улікам правільных, часткова правільных і няправільных адказаў 28 балаў з 33 магчымых. Тады:

28: 33 × 100 = 84,8. Значыць, паводле табліцы, адзнака – 8.

**Рэкамендаваная літаратура**

1. *Валочка, Г.М.* Беларуская мова : тэставыя работы : 8–11 класы / Г.М. Валочка, В.У. Зелянко. – Мінск : Аверсэв, 2013.

2. *Красней, В.П.* Беларуская мова. Тэставыя заданні для 5 класа. У 2 ч. / В.П. Красней, Я.М. Лаўрэль. – Мінск : Белы вецер, 2011.

3. *Красней, В.П.* Беларуская мова. Тэставыя заданні для 6 класа. У 2 ч. / В.П. Красней, Я.М. Лаўрэль. – Мінск : Белы вецер, 2012.

4. *Валочка, Г.М.* Беларуская мова. Тэставыя заданні для 7 класа. У 2 ч. / Г.М. Валочка, С.А. Язерская. – Мінск : Белы вецер, 2012.

5. *Бадзевіч, З.І.* Беларуская мова. Тэставыя заданні для 8 класа. У 2 ч. / З.І. Бадзевіч, І.М. Саматыя. – Мінск : Белы вецер, 2017.

6. *Міхнёнак, С.С.* Беларуская мова. Тэставыя заданні для 9 класа. У 2 ч. / С.С. Міхнёнак. – Мінск : Белы вецер, 2017.

7. *Валочка, Г.М.* Беларуская мова. 10 клас. Дыдактычныя і дыягнастычныя матэрыялы (базавы і павышаны ўзроўні) : дапам. для настаўнікаў устаноў агул.

сярэдняй адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М. Валочка, В.У. Зелянко, С.М. Якуба. – Мазыр : Выснова, 2021.

8. *Валочка, Г.М.* Беларуская мова. 11 клас. Дыдактычныя і дыягнастычныя матэрыялы (базавы і павышаны ўзроўні) : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэдняй адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М. Валочка, В.У. Зелянко, С.М. Якуба. – Мазыр : Выснова, 2021.